заселения Саратовского края». Сведения такого характера по селам и деревням Балашовского уезда были опубликованы Харизоменовым в 1888 г. в Трудах Саратовской ученой архивной комиссии [9, с. 264]. (Он был членом комиссии). Он называет письменные источники, из которых сведения почерпнуты, и отмечает, что большая часть исторических данных основана на устных преданиях. В конце 80-х– начале 90-х гг. XIX в. в трудах СУАК материалы по теме заселения Саратовской губернии помещали и другие члены комиссии – А. А. Голомбиевский, В. И. и Г. И. Холмогоровы. Они выявляли данные из документов, хранившихся в МАМЮ. Продолжал публиковать материалы по этой теме и Минх.

Изучение процесса заселения территории Саратовской губернии крестьянами из других регионов России стало особым направлением в трудах местных историков второй половины XIX в. Оно появилось под непосредственным влиянием постановки проблемы, актуальной в русской науке в тот период. Постановка проблемы повлекла за собой расширение круга источников. На основании работ саратовских историков по данной тематике видно, что они проявили полное понимание значимости источниковой базы для исторического исследования и были готовы к решению задач, которые стояли перед Саратовской ученой архивной комиссией.


1. Государственный архив Саратовской области (далее – ГАСО) – Ф. 407. Оп. 2. Д. 776.
2. Костомаров, Н. И. Очерк истории Саратовского края от присоединения его к Российской державе до вступления на престол императора Николая I / Н. И. Костомаров // Памятная книжка Саратовской губернии на 1858 год. – Саратов, 1858.– Отд. 3. –С. 1–55.
3. [Леопольдов, А. Ф.] Исторический очерк Саратовского края. Соч. Андрея Леопольдова / [А. Ф. Леопольдов]. – М., 1848. – 195 с.
4. Майорова, А. С. Изучение А. Н. Минхом истории заселения Саратовского Поволжья / А. С. Майорова // Известия Саратовского университета. Новая серия. Серия: История. Международные отношения. – 2021. – Т. 21, Вып. 2. – С. 264–269.
5. Минх, А. Н. Коленская волость / А. Н. Минх // Саратовский сборник. Материалы для изучения Саратовской губернии. – Саратов, 1881. – Т.1 : Отдел первый.– С. 65–176.
6. Минх, А. Н. Саратовский уезд / А. Н. Минх // Саратовский сборник. Материалы для изучения Саратовской губернии. – Саратов, 1882 . –Т. 2. – С. 203–327.
7. Нечкина, М. В. Василий Осипович Ключевский. История жизни и творчества / М. В. Нечкина. – М. : Наука, 1974. – 638 с.
8. [Перетяткович, Г. И.] Поволжье в XVII и начале XVIII века. (Очерки из истории колонизации края). Исследование Г. Перетятковича / [Г. И. Перетяткович]. – Одесса, 1882. – 399 с.+3 с+2 с.
9. Харизоменов, С. А. Материалы по истории заселения Саратовской губернии / С. А. Харизоменов // Труды СУАК. – Саратов, 1888. – Т. 1, Вып. 3. – С. 264–277.



**Новікаў С.Я.**


## НОВЫ ДАКУМЕНТАЛЬНЫ НАРАТЫЎ АБ НАЦЫСЦКІМ ГЕНАЦЫДЗЕ НА ТЭРЫТОРЫІ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 1941–1944 ГГ.

Напярэдадні 80-х угодкаў вызвалення Віцебскай вобласці ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў навуковая грамадскасць атрымала ад беларускіх архівістаў фундаментальнае 6-томнае выданне "Без тэрміну даўнасці. Беларусь" [4] аб злачынствах нацыстаў і іх памагатых у дачыненні да мірнага насельніцтва рэспублікі, у тым ліку Віцебскай вобласці ў 1941–1944 гг. [1]. Як адзначаюць у прадмове да гэтага зборніка наменнік дэкана гістарычнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава А.М. Пастэрнак і загадчык аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук С. В. Кулінок, "у гарадах і сельскай мясцовасці Віцебскай вобласці загінулі 151451, выгнана ў нямецкае рабства 68434 чалавек. У горадзе Віцебску, дзе да пачатку вайны налічвалася каля 200 тыс. насельніцтва, у дзень вызвалення апынулася ўсяго 118 чалавек" [1, с. 3].

Першае дакументальнае выданне "Без тэрміну даўнасці. Беларусь – Віцебская вобласць", якое выйшла ў канцы 2020 г., уключае 212 дакументаў і матэрыялаў з Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнага архіва дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, Занальнага дзяржаўнага архіва г. Полацка, а таксама дакументы з архіваў Расіі, Латвіі і ЗША па тэме злачынстваў нацыстаў і іх памагатых супраць мірнага насельніцтва на акупіраванай тэрыторыі Віцебскай вобласці. Іншымі словамі, дзякуючы з'яўленню ўнікальнага выдання чытацкая аўдыторыя атрымала магчымасць убачыць трагедыю беларускага народа ў кантэксце асобнай вобласці выключна праз архіўныя дакументальныя факты.

У зборніку па Віцебскай вобласці большасць дакументаў прыводзіцца ўпершыню. З'яўляючыся ўнікальным крыніцазнаўчым укладам у даследаванне праблемы, практычна ўсе апублікаваныя матэрыялы будуць служыць надзейнай крыніцавай базай для далейшай працы даследчыкаў па паглыбленні пошукаў над малавывучанымі старонкамі ваеннай гісторыі Віцебшчыны, у першую галаву, звязанымі са злачынствамі, учыненымі нацыстамі ў адносінах да мірнага грамадзянскага насельніцтва, у тым ліку яўрэяў, на акупаванай тэрыторыі 21 раёна Віцебскай вобласці: Аршанскага, Бешанковічскага, Браслаўскага, Верхнедзвінскага, Віцебскага, Глыбокскага, Гарадокскага, Докшыцкага, Дубровенскага, Лепельскага, Лёзненскага, Міёрскага, Полацкага, Пастаўскага, Расонскага,

Сенненскага, Талачынскага, Ушацкага, Чашніцкага, Шаркаўшчынскага, Шумілінскага. Звернем увагу чытача, што населеныя пункты ў зборніку прыведзены ў адпаведнасці з сучасным адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленнем Вецебскай вобласці.

Аналіз архіўных дакументаў дазваляе чытачу значна паглыбляць веды адносна месцаў прымусовага ўтрымання, якія знаходзіліся ў гады германскай акупацыі на тэрыторыі іх цяперашняй малой радзімы: гета, турмы, лагеры грамадзянскага насельніцтва, месцы вывазу людзей у Нямеччыну. Многія з іх з'яўляліся месцамі масавага знішчэння людзей. Ужо самой назвай "Без тэрміна даўнасці. Беларусь" аўтары-ўкладальнікі вызначылі канцэптуальную аснову распрацоўкі: пошук і выяўленне сапраўдных фактаў магчыма толькі праз выкарыстанне архіўных дакументаў.

Паўторым, што уключэнне аўтарамі-укладальнікамі ў зборнік 212 дакументаў дае падставу казаць, што гэта лічба роўна колькасці дакументаў у зборніку па Брэсцкай вобласці, значана большая чым па Гродзенскай (119), Гомельскай (150), Магілёўскай (163), але істотна саступае агульнай колькасці дакументаў у зборніку па Мінскай вобласці – 395. Адразу адзначым, што абсалютная большасць дакументаў да нядаўняга часу была недаступныя навукоўцам, таму маюць велізарнае даследчае значэнне. Чытачу будзе цікава ведаць, што Дзяржаўнага архіва РФ некалькі гадоў таму перадаў на пастаяннае захоўванне ў НАРБ лічбавыя копіі дакументаў НДзК СССР з фонду № Р-7021 (на правах арыгінала), пасля чаго ў НАРБ быў створаны фонд № 1569. Большасць выкарыстаных у зборніках дакументаў адклалася ў фондах Беларускага штаба партызанскага руху, падпольных партыйных і камсамольскіх органаў, партызанскіх фарміраванняў. Усе дакументы з рамках названых раздзелаў размешчаны па храналагічным прынцыпе.

Вектар тэматыкі апублікаваных дакументаў вызначаны двума галоўнымі напрамкамі. У якасці базавых у зборніках прадстаўлены два раздзелы: 1) "Нацысцкая палітыка генацыду і выпаленай зямлі", 2) "Расследаванне ваенных злачынстваў" – імі структурна адкрываюцца ў разрэзе абласцей дакументальныя часткі кожнага з шасці выданняў.

Так, у зборніку па "Віцебскай вобласці" першы раздзел ахоплівае 133 тэматычна падабраныя дакументы: аб абстаноўцы і правядзенні карных акцый, арыштах і расстрэлах насельніцтва на акупаванай тэрыторыі ў перыяд з 26 ліпеня па 4 верасня 1941 г. (дак. 1, 2, 3, 4, 5); аб злачынствах карнікаў у дачыненні да мясцовага насельніцтва (дак. 6, 7, 8, 9, 10, 11, 12, 13, 14); аб расстрэле мірнага насельніцтва ў адказ на нападзенне партызан на станцыю Слаўнае Талочынскага (дак. 15, 16, 17); аб правядзенні карных аперацый "Грыф", "Маланка", "Хатэмля-Аргуны" (дак. 18, 23); аб злачынствах захопнікаў у вёсках Віцебскага, Полацкага і Суражскага раёнаў (дак. 19, 21, 22); аб правядзенні карнай аперацыі "Нюрнберг" (дак. 25, 26, 27, 28); акты аб спаленні вёсак Суражскага, Полацкага, Гарадокскага раёнаў (дак. 29, 30, 31, 32, 33, 34, 35); аб наступствах злачынстваў нямецкіх карнікаў у вёсках Слабодка, Пунішча і Крыўцы Лепельскага раёна (дак. 36, 37); выніках правядзення карнай аперацыі "Зімовы лес" (дак. 39); спаленні вёсак Суражскага, Расонскага, Шаркаўшчынскага раёнаў (дак. 40, 41, 42, 43, 45), аб злачынствах, здзейсненых карнікамі ў час аперацыі "Зімовае чараўніцтва" (дак. 46, 47, 48, 49, 50, 51, 52, 53, 54, 55, 56, 57. 58, 59, 60), карнай аперацыі "Котбус" (дак. 72, 73, 74, 75. 76, 77, 78, 79, 80, 81. 82, 83, 84, 85, 86, 86, 87), "Фрыц" (дак. 95, 96); "Кармаран" (дак. 126, 127, 128, 129, 130, 131, 132) і інш. Сярод дакументаў, сабраных аўтарамі-укладальнікамі ў гэтым раздзеле, асаблівую цікавасць у чытача могуць выклікаць паказанні сведкаў (дак. 116, 117, 118, 119, 120, 121, 122, 123, 124) і матэрыялаў допытаў былых карнікаў (дак. 111, 112, 113, 114, 128, 129, 130).

Значнае месца сярод дакументаў займаюць акты аб злачынствах, учыненых нямецкімі захопнікамі ў 21 раёне Віцебскай вобласці, самім горадзе Віцебску, пратаколы допытаў сведкаў аб злачынствах, здзейсненых карнікамі супраць мірнага насельніцтва ў разрэзе раёнаў, дакладныя запіскі і данясенні партызанскіх злучэнняў аб становішчы ў зоне іх дзейнасці і г.д. Не менш важна, што сярод матэрыялаў значыцца вялікая колькасць пераводных нямецкіх дакументаў. Сабраныя ў гэтым раздзеле дакументы і матэрыялы ахопліваюць розныя аспекты нацысцкай палітыкі генацыду, раскрываюць канкрэтныя праявы тактыкі "выпаленай зямлі" германскіх акупантаў на тэрыторыі вобласці [1, с. 78].

Звернемся да дакументаў, якія раскрываюць трагічныя маштабы адной з карных аперацый "Зімовае чараўніцтва" супраць партызан Расонска-Асвейскай зоны. Яна праводзілася з 14 лютага па 30 сакавіка 1943 г. З дакументаў (дак. 46, 47, 48, 49, 50, 51, 52, 53, 54, 55, 56, 57, 58, 59, 60) вынікае, што акупантам удалося нанесці партызанам адчувальныя страты. Загінулі і атрымалі раненні значная колькасць байцоў і камандзіраў, была страчана немалая частка харчовых запасаў, разбураны партызанскія лагеры. Вялізныя страты нанесены мірнаму насельніцтву. У ходзе аперацыі знішчана 3500 мірных жыхароў, 2000 чалавек адпраўлена на прымусовыя работы ў Германію, больш за 1000 дзяцей вывезены ў Саласпілскі лагер смерці. Падчас гэтай аперацыі спалена 158 вёсак, 45 з іх не адрадзіліся. Асабліва вялікія страты панёс Асвейскі раён, пераўтвораны ў зону пустыні, у якім ацалелі толькі дзве вёскі [1, с. 65–79].

Аналіз падборкі дакументаў, тэматычна звужаных да паказу вынікаў карных аперацый на тэрыторыі Віцебскай вобласці, дае падставы вылучыць тэматычна вузкія блокі матэрыялаў, скампанаваных для раскрыцця гісторыі карных аперацый: "Нюрнберг", 19–30 лістапада 1942 г., "Зімовае чараўніцтва", 15 лютага–30 сакавіка 1943 г., "Котбус", 19 мая–30 ліпеня 1943 г., "Фрыц", 14 кастрычніка – 6 лістапада 1943 г., "Кармаран", май– чэрвень 1944 гг. Аднак нават уважлівы чытач не здолее сярод прыведзеных дакументаў знайсці неабходныя звесткі аб усіх наступствах гэтых карных аперацый, галоўнае – знайсці адказ аб рэальнай трагедыі праведзеных акцый скрозь крытэрый страт мірнага мясцовага насельніцтва. Колькасць спаленых вёсак ці дамоў іх жыхароў паказваюць толькі адзін бок гістарычнай трагедыі беларускіх вёсак. Па нашым перакананні, галоўным крытэрыем трагедыі беларускага народа ў гады германскай акупацыі неабходна лічыць людскія страты, то бок выяўляць любыя звесткі пра агульную колькасць людзей, якія сталі ахвярамі карных аперацый нямецкіх захопнікаў у дачыненні да жыхароў беларускіх вёсак, якія апынуліся заложнікамі ў час правядзення карный аперацый супраць партызан. Чытач не здолее знайсці з прыведзеных дакументаў поўныя звесткі аб маштабах людской катастрофы па выніках правядзення кожнай з гэтых карных акцый. Як будзе адзначана ніжэй у другім дадатку, са жніўня 1941 г. па чэрвень 1944 г. на тэрыторыі Віцебскай вобласці былі праведзены 45 карных аперацый: у дачыненні да кожнай з іх прыводзіцца назва або згадваецца нумар, даецца дата яе правядзення і прыводзіцца раённая лікалізацыя аперацыі па сучасным адміністрацыйным дзяленні. Аднак у гэтым дадатку адкрытымі застаюцца вельмі важныя крытэрыі, то бок: колькасць загінуўшых мірных жыхароў, палоненых, захопленых у якасці працоўнай сілы, а таксама захопленых трафеяў – узбраенняў, прадуктаў харчавання, жывёлы і інш.

У якасці прыкладу возьмем адну з карных аперацый – "Кармаран", праведзеную з 25 мая па 17 чэрвеня 1944 г. Як адзначалася вышэй, у зборніку дакументаў аўтары-укладальнікі прывялі толькі 7 дакументаў, у тым ліку два данясенні аб баявых дзеяннях 1-й Беларускай брыгады (дак. 126, 127), а таксама тры пасляваенных паказанні былых ваеннаслужачых 201-й нямецкай ахоўнай дывізіі (дак. 128, 129, 130) і два пасляваенных допыты былых партызан 1-й брыгады ім К.С. Заслонава (дак. 131, 132). Аднак з іх зацікаўлены чытач не атрымае канкрэтныя звесткі аб маштабах трагедыі беларускага сялянства ў ходзе правядзення гэтай карнай акцыі. Таму звернемся да спецыяльнага зборніка дакументаў і матэрыялаў агульнай колькасцю 634 адзінак, сабраных аўтармі-укладальнікамі пад кіраўніцтвам В.Д. Селяменева па нацысцкай карнай аперацыі "Кармаран" [4]. Лічылася, што важнейшым сярод апублікаваных дакументаў з'яўляецца "Дакладная запіска Р.Н. Мачульскага і прадстаўніка БШПР А.Ф. Бардадына першаму сакратару ЦК КП(б)Б П.К. Панамарэнка і начальніку БШПР П.З. Калініну "Аб дзеяннях партызанскіх брыгад Барысаўска-Бягомльскай партызанскай зоны за перыяд з 20 мая па 27 чэрвеня 1944 года" [3, с. 435–453]. У дакуменце канстатуецца, што за час правядзення карнай аперацыі праціўнік па заніжаных даных панёс наступныя страты: забіта 3735, ранены 2400 і ўзяты ў палон каля 1000 нямецкіх салдат і афіцэраў, пры гэтым страты партызан за час блакады склалі забітымі, палоннымі і зніклымі без вестак – 2416 чалавек [2, с. 449].

Параўнаем гэтыя звесткі з дадзенымі, якія прыводзіў камандуючы вермахтам у Беларусі па выніках аперацыі "Кармаран" па стане на 20.06.1944 г. Паводле нямецкага дакумента (дак. 458), апублікаванага ў вышэйзгаданым зборніку, страты праціўніка, то бок партызан, за гэты час склалі: забітымі 4252 і 360 партызан захоплена ў палон [5, с. 319]. Зварот да нямецкіх навуковых даследаванняў, у першую чаргу да фундаментальнай працы К. Герлаха паказвае, што праведзеная ў раёне трохкутніка Вілейка – Барысаў – Мінск вялікая карная аперацыя "Кармаран" мела наступныя вынікі: былі забітыя 7697 чалавек, 5286 былі ўзяты ў палон, 5973 мясцовых жыхароў былі выгнаны на прымусовыя работы [7, s. 904]. Пры гэтым адметным для чытача павінна з'яўляцца тое, як адзначае нямецкі даследчык, што большасці забітых і палоненых была без зброі, яна адсутнічала ў 85 да 90% забітых і палоненых. Інакш кажучы, абсалютная большасць ахвяр з'яўляліся мірныя людзі, сяляне беларускіх вёсак. Аднак гэтыя звесткі без прыцягнення нямецкіх архіўных крыніц ці гістарыяграфічных фактаў пакуль застаюцца невядомымі для шырокай чытацкай аўдыторыі.

У другім раздзеле зборніка апублікаваны 79 дакументаў, практычна каля трэці ў параўнанні з вершай часткай, якія прысвечаны адной за самых складаных тэм – расследаванню і ўстанаўленню фактаў ваенных злачынстваў, учыненых нацыстамі на акупаванай тэрыторыі Віцебскай вобласці і г. Віцебска, а таксама ўсіх вышэй пералічаных раёнаў. Аснову дакументаў першай часткі складаюць дакументы НДзК (дак. 134–146), паказанні ваенных злачынцаў (дак. 147–150) і паказанні сведак (дак. 151–153). Аснову другой дакументальнай часткі па 21 раёне Віцебскай вобласці складаюць акты раённых камісій садзейнічання НДзК аб забойстве гітлераўцамі мірнага насельніцтва і ваеннапалонных у гады акупацыі. Апроч таго, прыводзяцца пратаколы допытаў былых нямецкіх ваеннаслужачых (дак. 156, 157, 168, 171, 172, 179, 186, 190), успаміны тых, хто выратаваўся (дак. 158, 159, 162, 163, 177, 197, 198, 210, 211), а таксама пратаколы допытаў сведак (дак. 176, 193, 205).

Надзвычай важнымі для даследчыкаў з'яўляюцца тэматычныя дадаткі, у якіх аўтары-укладальнікі апублікавалі: 1) спісы месцаў прымусовага ўтрымання грамадзянскага насельніцтва на акупаваных тэрыторыях шасці абласцей БССР; 2) спіс месцаў масавага знішчэння і дэпартацыі яўрэяў з акупаваных тэрыторый шасці абласцей; 3) спіс найбольш буйных нямецкіх карных аперацый, праведзеных на тэрыторыях шасці абласцей; 4) спіс сельскіх населеных пунктаў, знішчаных нямецкімі акупантамі поўнасцю або часткова, разам з насельніцтвам або без яго. Пры складанні спісаў аўтары-укладальнікі часта сутыкаліся з шэрагам цяжкасцяў пры вызначэнні навуковай класіфікацыі месцаў прымусовага ўтрымання, іх лакалізацыі, часу стварэння і ліквідацыі.

З дакументальных матэрыялаў зборніка вынікае агульная лічба ў колькасці 3541 вёсак, спаленых нямецкімі акупантамі поўнасцю або часткова, разам з насельніцтвам або без яго на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Кожная трэццяя знішчаная вёска знаходзілася на Віцебшчыне: 243 вёскі спальваліся двойчы, 83 – тройчы, 22 – чатыры разы і больш, у тым ліку: Канчаны Верхнядзвінскага раёна – 3 разы, Арцейкавічы Полацкага, Рачныя Докшыцкага раёнаў – 4 разы, Рагозіна Ушацкага раёна – 5 разоў, Ладасна Лепельскага раёна – 6 разоў і г.д. З 5295 вёсак 3% вёсак былі знішчаны ў 1941 г., 16% – у 1942 г., 63% – у 1943 г. 18% – у 1944 г. [6, с. 8–9].

Такім чынам, крыніцазнаўчы агляд дакументальнага зборніка па Віцебскай вобласці прыводзіць нас да высновы, што публікацыя архіўных дакументаў бачыцца аўтару гэтых радкоў надзвычай важнай найперш у святле неабходнасці праўдзівага раскрыцця адной з самых трагічных старонак ваеннай гісторыі Беларусі. Публікацыя новых і вядомых на гэты час дакументаў ставіць у парадак дня сучаснай беларускай гістарычнай навукі актуальную задачу па ўсебаковым асэнсаванні, аналізе і праверцы дакументальных фактаў, уведзеных у шырокі навуковы зварот беларускімі архівістамі, і правядзення на новай базе крыніц усебаковага даследавання трагічных наступстваў нацысцкага генацыду ў дачыненні да мірнага насельніцтва аднаго з самых пацярпелых рэгіёнаў Беларускай ССР – Віцебскай вобласці.


1. Без срока давности. Беларусь: преступления нацистов и их пособников против мирного населения на оккупированной территории БССР в годы Великой Отечественной войны. Витебская область. Сборник архивных документов и материалов / сост.: А. Р. Дюков, В. Д. Селеменев (рук.) [и др.] ; редкол. : А. К. Демянюк [и др.]. – Минск : НАРБ ; М. : Фонд «Историческая память», 2020. – 932 с.
2. Докладная записка Р. Н. Мачульского и представителя БШПД А. Ф. Бардадына первому секретарю ЦК КП(б)Б П. К. Пономаренко и начальнику БШПД П. З. Калинину «О действиях партизанских бригад Борисовско-Бегомльской партизанской зоны с 20 мая по 27 июня 1944 года» // «Корморан». Нацистская карательная операция в Беларуси, май–июнь 1944 г. : документы и материалы / сост.: В. Д. Селеменев (рук.) [и др.] ; редкол.: Д. Г. Воропаев [и др.]. – Минск : НРАБ, 2020. – С. 435–453.
3. «Корморан». Нацистская карательная операция в Беларуси, май–июнь 1944 г.: документы и материалы / сост.: В. Д. Селеменев (рук.) [и др.] ; редкол.: Д. Г. Воропаев [и др.]. – Минск : НРАБ, 2020. – 712 с.
4. Проект «Без срока давности. Беларусь» – это весомый вклад белорусских архивистов в реализацию государственной исторической политики [Электроонный ресурс]. – Режим доступа: https://pravo.by/novosti/obshchestvenno -politicheskie-i-v-oblasti-prava/2022/december/72475/. – Дата доступа: 19.02.2023.
5. Сводная таблица командующего вермахтом в Белоруссии об итогах операции «Корморан» за период с 25 мая по 17 июня 1944 г. // «Корморан». Нацистская карательная операция в Беларуси, май–июнь 1944 г.: документы и материалы / сост.: В. Д. Селеменев (рук.) [и др.] ; редкол.: Д. Г. Воропаев [и др.]. – Минск : НРАБ, 2020. – С. 318–319.
6. Сожженные деревни Белоруссии, 1941–1944 : lокументы и материалы / сост. Н. В. Кириллова, В. Д. Селеменев [и др.]. – М. : Фонд «Историческая память», 2017. – 512 с.
7. Gerlach, Ch. Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrussland 1941 bis 1944 / Ch. Gerlach. – Hamburg : Hamburger Edition, 2000. – 1232 s.



**Маджаров А.С.**


## ИСТОРИЧЕСКИЙ МЕТОД О. ШПЕНГЛЕРА (ИСТОЧНИКОВЕДЧЕСКИЙ АСПЕКТ)

***Актуальность, цель исследования.*** Относительная достоверность высказанных Освальдом Шпенглером (1880–1936) прогнозов развития Запада предопределила актуальность его сочинений. В наши дни творчество ученого привлекало вниманием исследователей К.А Свасьяна, И.И. Маханькова, Л.Г. Зимовец, Т.Г. Румянцевой и др. [1; 2; 3; 5]. По словам Т.Г. Румянцевой, идеи немецкого философа «оказались… созвучными» событиям минувшего столетия и наших дней [5, с. 814]. Действительно, цивилизационный подход к всемирной истории, который О. Шпенглер развивал наряду с Н.Я. Данилевским (1822–1885), А.Дж. Тойнби (1889–1975) и другими мыслителями, позволил ему прикоснуться к основам исторического процесса, динамике будущего.

В книге «Закат Западного мира» он раскрыл палитру фаустовской души, накал и константное направление ее дерзаний. Касаясь, в частности, внешнеполитических амбиций порожденного «родным ландшафтом» истеблишмента, Шпенглер утверждал: «фаустовская культура всегда была направлена на распространение <…> политического, экономического или духовного характера». Все мыслители и вожди от Экхарта до Канта и от Оттона Великого до Наполеона желали «покорить мир», увеличить «собственную жизненную единицу <…> за счет других» [6, с. 366, 903]. А подводя в